## № 119. Язэпу Пушчу

*13.VIII.1935*

Дарагі браце Язэп!

Тваю паштоўку ад 24 ліпеня атрымаў і чакаў далейшых вестак. Аж іх няма і да сягодня. Ці здароў хаця сам і сям'я? Што чуваць з вызваленьнем, ці атрымаў ты яго?

Ня ведаю, ці дайшла да цябе мая паштоўка, у якой я паведамляў пра дадатак двух год мне і іншым некаторым. Надоечы ж атрымаў ліст ад Уладзіка з такою ж сумнаю весткаю: дабавілі і яму два гады.

Што гэта ўсё мае значыць, хто яго ведае. Крыўдна робіцца за гэты дадатак.

Сям'я мая ўсё яшчэ на старым месцы. Ніяк не магу агараць тут кватэру.

Пішы, Язэп. Вітаю тваю сям'ю.

Цалую цябе.

Твой *Адам*.

## № 120. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*18.VIII.1935*

Любыя Анечка, Лорачка, Лялячка!

Сёньня я чакаў цябе, Анечка. Выходзіў на вакзал сустракаць. Ажно чамусьці ты не прыехала. А хацелася мне пагаварыць з табою наконт атрыманай табою тэлеграмы з Анапы. Мая думка, што лепш за ўсё табе пераехаць туды на працу, і калі ты яшчэ нічога не адказвала туды, дык варта было–б сур'ёзна над гэтым падумаць. Я ведаю, што ты будзеш супроць гэтага, але гэта дарэмна. Калі разважыць добра, дык ня варта ўпушчаць гэтага выпадку і магчымасьці перабрацца туды. Два гады разьдзельнага жыцьця — гэта, зрэшты, невялікі тэрмін. А магчыма, што ён і скароціцца. Заявы я напішу і буду пісаць не аднойчы. Падумай, Анечка, над гэтым добра і, перамогшы свае пачуцьці, паслухайся развагі. Шкадаваць ня будзем.

Цалую цябе і дзетак.

*Адам*.

Прыяжджай, як толькі атрымаеш гэту паштоўку. Не чакай выхаднога дню.

## № 121. Язэпу Пушчу

*20.VIII.35*

Любы браце Язэп!

Я вельмі рад, што ты атрымаў вызваленьне. І каб ты зараз жа здолеў выехаць у Анапу, то магчыма, яшчэ засьпееў бы сабе работу ў сярэдняй школе. Мая атрымала гэтымі днямі тэлеграму адтуль, каб прыяжджала на працу ў дзесяцігодку выкладчыкам мовы і літаратуры. Ты ж мог гэта месца заняць. Што ж да кватэры, дык, па вестках адтуль, там ня так і цяжка з імі. Народу там бывае шмат толькі ўлетку. А як сэзон канчаецца, дык і кватэры вызваляюцца. За 25–40 руб. заўсёды можна знайсьці ладны пакой. Што да твае просьбы, дык я напішу свайму знаёмаму. А калі б ты